**Тэма 2. Гістарыяграфія ранніх буржуазных рэвалюцый. Асноўныя тыпы гістарычных крыніц.**

1. Найважнейшыя дасягненні гістарыяграфіі ранніх буржуазных рэвалюцый (19 ст. – 30-х гг. 20 ст.)
2. Гістарыяграфія ранніх буржуазных рэвалюцый у краінах Захаду пасля Другой сусветнай вайны.
3. Савецкая і постсавецкая гістарыяграфія ранніх буржуазных рэвалюцый.
4. Асноўныя тыпы крыніц па гісторыі ранніх буржуазных рэвалюцый**.**

**Літаратура**

Историография истории нового времени стран Европы и Америки. - М., 1990.

Историография истории нового и новейшего времени стран Европы и Америки. / Под ред И.П. Дементьева, А.И. Патрушева. – М., 2000.

Мосолкина, Т. В. Курс лекций по источниковедению новой и новейшей истории / Т. В. Мосолкина, Н. И. Николаева. – Саратов, 2004.

1. Пра навуковае вывучэнне буржуазных рэвалюцый можна гаварыць з першай паловы 19 ст. Сярод даследчыкаў, якія былі ля вытокаў вывучэння ранніх буржуазных рэвалюцый, неабходна ў першую чаргу назваць гісторыкаў ліберальнай школы эпохі Рэстаўрацыі ў Францыі. Адзін з лідараў гэтай школы **Агюстэн Цьеры** (1795–1856) лічыў, што вытокі Французскай рэвалюцыі канца 18 ст. трэба шукаць у заваяванні Галіі франкамі. Вынікам заваявання стала тое, што ў Францыі ўтварылася два народы: заваёўнікі-франкі, стаўшыя дваранамі, і заваяванае гала-рымскае насельніцтва, з якога выйшла 3-е саслоўе. Іх барацьба пранізвае ўсю далейшую гісторыю краіны. Яе важнейшай вехай стала Французская рэвалюцыя канца 18 ст. Рэвалюцыю А. Цьеры разглядае як класавую барацьбу, якая з'яўляецца вынікам заваявання і выступае як барацьба розных нацыянальнасцяў.

**Франсуа Агюста Мінье** (1796–1884) лічыць, што да рэвалюцыі ў Францыі яшчэ існавалі сярэдневяковыя формы грамадства. Рэвалюцыя змяніла не толькі палітычную ўладу, але зрабіла пераварот ва ўсім стане нацыі. Гісторыю рэвалюцыі Ф. Міньє разглядаў як барацьбу розных класаў. Усе гады рэвалюцыі прайшлі ў імкненні аднаго з класаў, складаўшых нацыю, усталяваць сваё панаванне. Ф. Міньє вызначыў у рэвалюцыі тры асноўныя змагаючыяся сілы. Прывілегіраваныя класы імкнуліся ўсталяваць свой парадак супраць двара і буржуазіі. Сярэдні клас, ці буржуазія, адстойвала прынцып свабоды і змагалася супраць прывілегіраваных і супраць народных мас. Яе інтарэсы ўвасобіла Канстытуцыя 1791 г. Народ адстойваў прынцып роўнасці. Спробай мас захапіць уладу была Канстытутуцыя 1793 г. і якабінская дыктатура.

Адным з першых даследчыкаў Англійскай рэвалюцыі 17 ст. стаў таксама прадстаўнік Ліберальнай школы эпохі Рэстаўрацыі **Франсуа Гізо.** На

яго думку, Англійская рэвалюцыя складалася з 4 актаў: 1) цараванне Карла I і яго барацьба з доўгім парламентам; 2) рэспубліка на чале з Кромвелем; 3) рэстаўрацыя Сцюартаў; 4) канчатковае падзенне Сцюартаў і ўступленне на трон Вільгельма Аранскага. Такім чынам, рэвалюцыя цягнулася з 1625 па 1688 г. На думку Ф. Гізо, у Англійскай рэвалюцыі рэлігійная і палітычная барацьба хавалі сацыяльнае пытанне і барацьбу розных класаў за ўладу і ўплыў. Ён указваў, што ў той час, як англійская манархія імкнулася да абсалютызму, у грамадстве ўмацоўваліся сілы, якія выступалі супраць абсалютызму. Прычыны Англійскай рэвалюцыі Ф. Гізо звязваў з развіццём у краіне капіталістычных адносін, у выніку чаго адбылося пераразмеркаванне зямельнай уласнасці на карысць простага дваранства, буржуазіі, і новыя ўласнікі патрабавалі ўдзелу ў кіраванні краінай. Ён бачыць тры важнейшыя вынікі Англійскай рэвалюцыі: 1) каралеўская ўлада была абмежавана парламентам; 2) у парламенце ўлада належала палаце абшчын, г. з. новаму дваранству; 3) у Англіі ўсталявалася панаванне пратэстантызму.

У англійскай гістарыяграфіі ў першай палове 19 ст. адным з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў рэвалюцыйных падзей 17 ст быў **Томас Макалей** (1800–1859). Ён пры характарыстыцы Англійскай рэвалюцыі сярэдзіны 17 ст. рабіў акцэнт на яе пурытанскі характар. Канфлікт паміж парламентам і манархам з-за ўладных прэрагатыў адыходзіў на другі план. Галоўным у рэвалюцыі прадстаўляўся рэлігійны канфлікт. У цэнтры даследаванняў Т. Макалея была «Слаўная рэвалюцыя» 1688 г. Ён прыўзносіў гэтую рэвалюцыю як узор з-за яе бязкроўны характар і супрацьпастаўляў яе рэвалюцыйным падзеям сярэдзіны 17 ст. Апошнія, на думку Т. Макалея, падарвалі магутнасць і веліч Англіі. **Сэмюэль Гардзінер** (1829–1902) ужо ў другой палове 19 ст. у сваёй трактоўцы Англійскай рэвалюцыі таксама прытрымліваецца пурытанскай канцэпцыі. Ён лічыць, што ў рэвалюцыі галоўным была не барацьбу двух пачаткаў – дыспатызму ў асобе караля і векавых англійскіх свабод, якія ўвасабляў парламент. Згодна яго канцэпцыі ў рамках Англійскай рэвалюцыі перш за ўсё адбывалася барацьба рэлігійных прынцыпаў, пурытан супраць англіканскай царквы.

Адным з першых навуковых даследаванняў гісторыі Сялянскай вайны ў Германіі з’яўляецца праца **Вільгельма Цымермана** “Гісторыя сялянскай вайны ў Германіі”. Аўтар адзначае змены якія адбываліся ў свядомасці, у тым ліку і ніжэйшых пластоў грамадства, пад уздзеяннем Рэфармацыі, у выніку якіх сяляне не хацелі больш цярпець узмацняўшыся гнёт з боку пануючых слаёў грамадства. В. Цымерман разглядае Сялянскую вайну, якая адбылася ва ўмовах пераходу ад старога феадальнага грамадства да новага, буржуазнага, як рэвалюцыю, у першую чаргу рэлігійную і палітычную. Але гэтая рэвалюцыя не была даведзена да завяршэння, што прадвызначыла захаванне раздробленасці Германіі на тры стагоддзі і павольныя тэмпы развіцця капіталізму. Адна з буйнейшых гістарычных прац у 19 ст., прысвечаная гісторыі Сялянскай вайны 1524–1525 гадоў, належыць **Фрыдрыху Энгельсу.** Ён прайшоў да высноў, што паражэнне сялян было абумоўлена здрадніцкай палітыкай бюргерства і разрозненасцю і

неарганізаванасцю сялянскіх мас, якія няздольныя самастойна давесці сваю барацьбу да пераможнага завяршэння. А кіраўніцтва з боку тагачаснай нараджаючайся германскай буржуазіі сялянства было пазбаўлена.

З канца 19 стагоддзя можна гаварыць аб новым этапе ў вывучэнні буржуазных рэвалюцый, які будзе цягнуцца да пачатку Другой сусветнай вайны. У французскай гістарыяграфіі **Іпаліт Тэн** (1828–1893) глыбінным вытокам рэвалюцыі лічыў асаблівасці французскага духу, склаўшагася пад уплывам рацыянальнай навукі і Асветніцтва. У французаў сфарміраваўся абстрактны прамалінейны тып свядомасці, пад уздзеяннем якога яны імкнуцца падначаліць тэарэтычнай жорсткай схеме жывую, напоўненую шматграннасцю рэчаіснасць. На рэалізацыю такіх схем распрацаваных асветнікамі, і была накіравана Французская рэвалюцыя. Іншую трактоўку рэвалюцыйным падзеям даваў **Альфонс Алар** (1849–1928). Рэвалюцыю ён разглядаў як увасабленне ў жыццё прынцыпаў Дэкларацый правоў чалавека і грамадзяніна 1789 і 1793 г. Рэвалюцыя заключалася ў гэтых Дэкларацыях і спробах правесці ў жыццё іх прынцыпы. Контррэвалюцыя ж заключалася ў спробах прымусіць французаў адмовіцца ад правядзення ў жыццё прынцыпаў Дэкларацый. Для А. Алара было характэрна ўзвялічванне ролі Дантона ў рэвалюцыі. Галоўным станоўчым момантам працы А. Алара было тое, што яна ўтрымлівала велізарны матэрыял адносна палітычных аспектаў Французскай рэвалюцыі.

У пачатку 20 ст. у французскай гістарыяграфіі рэвалюцыі канца 18 ст. развіваўся рабесп’ерысцкі кірунак. Яго найбольш яркім прадстаўніком з’яўляўся **Альбер Мацьез** (1874–1932). Ён у сваіх працах высока ацэньваў дзейнасць Рабесп’ера і якабінцаў як найбольш перадавой палітычнай групоўкі часоў рэвалюцыі. Якабінскі рэжым быў, згодна Мацьезу, ключавым перыядам рэвалюцыі. З пункту гледжання А. Мацьеза, Французская рэвалюцыя забяспечыла перамогу буржуазіі, для яе дасягнення вымушанай пайсці на буйныя саступкі сацыяльным патрабаванням народа, каб атрымаць яго падтрымку. Ён разглядае рэвалюцыю як барацьбу трэцяга саслоўя супраць прывілегіраваных саслоўяў. Пры далейшым развіцці рэвалюцыі ўсё больш вострыя сацыяльныя супярэчнасці, на думку Мацьеза, узнікаюць паміж жырандыстамі і якабінцамі. Асноўны навуковы ўклад Мацьеза ў вывучэнне гісторыі Французскай рэвалюцыі звязаны са зваротам да даследавання ролі ў ёй гарадскіх нізоў (галоўным чынам у Парыжы).

**Жорж Ле Феўр** (1874–1959) у сваіх работах працягнуў якабінскую традыцыю гісторыі рэвалюцыі, вельмі высока ацэньваў гістарычную ролю якобінцаў і Рабесп’ера. Уклад Ж. Ле Феўра ў вывучэнне Французскай рэвалюцыі звязаны, перш за ўсё, з распрацоўкай яе сацыяльнай гісторыі і ролі ў ёй сялянства. Галоўная яго думка заключалася ў тым, што ў рамках Французскай рэвалюцыі разгарнулася особная сялянская рэвалюцыя. Мэтаю гэтай рэвалюцыі была барацьба за захаванне і ўмацаванне сялянскай гаспадаркі, вобразу жыцця, сацыяльных і духоўных каштоўнасцяў сельскага свету. Сяляне прымусілі буржуазную рэвалюцыю знішчыць сеньярыяльны лад. Але яны пратэставалі і супраць безумоўнага панавання буржуазнай

зямельнай уласнасці і патрабавалі захавання абшчынных інстытутаў і абмежавання буйнога землеўладання. Сялянская рэвалюцыя, згодна Ле Феўру, разбурыла феадальны рэжым, замацавала дробнасялянскую аграрную структуру Францыі. У выніку капіталістычная эвалюцыя была вельмі маруднай і заставалася незакончанай.

У англійскай гістарыяграфіі ў першай палове 20 ст. трактоўка гісторыі рэвалюцыі 17 ст. зводзілася пераважна да высокай адзнакі дзейнасці парламента, які заклаў асновы брытанскай дэмакратыі ў барацьбе з неабмежаванай каралеўскай уладай. Прыкладам такой трактоўкі з'яўляецца работа **Г. Дэвіса** «Раннія Сцюарты» (1937). У кнізе была спроба выйсці за межы разгляду Англійскай рэвалюцыі як рэлігійна-палітычнага канфлікту. Г. Дэвіс падкрэсліваў неабходнасць вывучэння эканамічнага і сацыяльнага фону для глыбейшага пранікнення ў праблематыку палітычнай гісторыі Англійскай рэвалюцыі сярэдзіны 17 ст., для разумення сутнасці пурытанскага руху.

Пры даследаванні Першай Амерыканскай рэвалюцыі гісторыкі імперскай школы **Чарлз М. Эндрус** (1863–1943), **Эдвард Чанінг** (1856–1931) у Вайне за незалежнасць ЗША бачылі толькі эпізод развіцця англійскай каланіяльнай сістэмы. Супярэчнасці паміж амерыканскімі калоніямі і Англіяй зводзіліся імі да пытання аб ступені самакіравання заморскіх тэрыторый Брытанскай імперыі. Хоць гісторыкі «імперскай школы» прама не адмаўлялі неабходнасці Вайны за незалежнасць, але яны падыходзілі да гэтай высновы, сцвярджаючы, што наданне калоніям статуса даміньёна магло б прадухіліць паўстанне ў Амерыцы. Гісторыкі «імперскай школы» адмаўляліся ў Вайне за незалежнасць бачыць рэвалюцыю, масавы антыкаланіяльны і сацыяльны рух, ставілі пад сумненне глыбокія грамадскія змены ў краіне пасля перамогі паўстаўшых каланістаў.

Гісторыкі, якія належалі да прагрэсісцкай школы (**Артур Шлезінгер-старэйшы** (1888–1965), **Джон Ф. Джэймсан** (1850–1937)), лічылі, што вострыя сацыяльныя кантрасты каланіяльнага перыяду паслужылі найважнейшай прычынай рэвалюцыі 1775–1783 гадоў. Гісторыкі-прагрэсісты не надавалі колькі-небудзь пільнай увагі антыкаланіяльнаму аспекту Першай Амерыканскай рэвалюцыі. Па іх перакананню, найважнейшы аспект рэвалюцыі складала пытанне аб унутрыпалітычных пераўтварэннях у Паўночнай Амерыцы, таму яна характарызавалася як унутраная рэвалюцыя.

2. Пасля Другой сусветнай вайны **Жорж Ле Феўр** у сваіх работах падкрэсліваў важнасць вывучэння эканамічнай і сацыяльнай гісторыі, становішча народных мас, сацыяльнай псіхалогіі, геаграфічных і біялагічных фактараў эвалюцыі грамадства для разумення зместу рэвалюцыі. Ён высока ацэньваў гістарычную ролю рэвалюцыі і дзейнасць якабінцаў, надаваў галоўную ўвагу даследаванню рэвалюцыйнага працэсу «знізу», з пункту гледжання народных мас. Ён лічыў, што ў ходзе рэвалюцыі назіраўся самастойны сялянскі рух са сваімі мэтамі. Вучань Ж. Ле Феўра **Альбер Сабуль** (1914–1982) даказваў жывучасць феадальных адносін у Францыі

напярэдадні рэвалюцыі і падкрэсліваў ролю рэвалюцыі ў іх знішчэнні. А. Сабудь распачаў даследаванне ролі ў рэвалюцыі народных мас горада, санкюлотаў. Па яго меркаванні, гэтак жа, як і самастойны сялянскі рух, у рамках рэвалюцыі існаваў і развіваўся спецыфічны рух санкюлотаў, якія патрабавалі эгалітарнай і народнай рэспублікі. Дзякуючы дзеянням санкюлотаў была звергнута Жыронда і ліберальная рэспубліка, а затым створаны рэвалюцыйны ўрад на чале з Рабесп'ерам, які абапіраўся на саюз мантаньярскай буржуазіі і парыжскіх санкюлотаў. Але пасля першых буйных ваенных перамог рэвалюцыі саюз рэвалюцыйнай буржуазіі і санкюлотаў распаўся і пала якабінская дыктатура. Санкюлоты не змаглі дасягнуць сваіх уласных мэт у рэвалюцыі, але іх рух, па Сабулю, спрыяў гістарычнаму прагрэсу дзякуючы вялікай дапамозе, якую яны аказалі буржуазнай рэвалюцыі.

З пачатку 1970-х гадоў група гісторыкаў на чале з **Франсуа Фюрэ** распачала спробу перагледзець («рэвізаваць») ранейшыя ўяўленні аб Французскай рэвалюцыі, выкладзеныя ў працах Мацьеза, Ле Феўра, Сабуля і даць новую інтэрпрэтацыю рэвалюцыйных падзей. Ф. Фюрэ і яго аднадумцы атакавалі марксісцкую і наогул «традыцыйную» канцэпцыю, па якой Французская рэвалюцыя насіла антыфеадальны, буржуазны характар, а яе вышэйшым этапам з'яўлялася якабінская дыктатура. З іх пункту гледжання, у 1789 г. адбылася не адна рэвалюцыя, а сутыкненне трох рэвалюцый: рэвалюцыі ліберальнай эліты, рэвалюцыі сялян і рэвалюцыі санкюлотаў. Толькі рэвалюцыя эліты – адукаванага ліберальнага дваранства і буйной буржуазіі, якія імкнуліся да абнаўлення, з'яўлялася, па меркаванні Ф. Фюрэ, прагрэсіўнай. Наадварот, сялянская і санкюлоцкая рэвалюцыі, прасякнутыя эгалітарнымі ідэямі, перашкаджалі прагрэсіўнаму развіццю грамадства па шляху капіталізму. Асабліва адмоўную ролю, па Фюрэ, адыграла якабінская дыктатура, калі Францыю "занесла" ў бок ад правільнага шляху, вызначанага ліберальнай элітай. Толькі тэрмідарыянскі пераварот паклаў канец гэтаму «заносу», і французская гісторыя аднавіла свой нармальны ход. Ф. Фюрэ абвясціў «міфам» марксісцкую трактоўку рэвалюцыі як пераход ад феадалізму да капіталізму. Ён даказваў, што яна не парвала з феадалізмам які, па яго меркаванні, знік яшчэ да рэвалюцыі. Галоўным зместам рэвалюцыі Ф. Фюрэ лічыў не сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, а стварэнне дэмакратычнай палітычнай культуры. Яе вынікам было сцвярджэнне парламенцкага рэжыму і дэмакратычных парадкаў.

Пасля Другой сусветнай вайны тлумачэнні прыроды Англійскай рэвалюцыі сфакусаваліся ў канца 40-х – пачатку 60-х гадоў у г. з. "спрэчцы аб джэнтры". У цэнтры гэтай дыскусіі апынуліся працілеглыя тэзісы гісторыкаў **Рычарда Тоўні** і **Х'ю Трэвара-Роўпера**. Р. Тоўні тлумачыў паходжанне Англійскай рэвалюцыі зменамі ў матэрыяльным дабрабыце заможных сацыяльных груп. Гэтыя змены здзяйсняліся з часоў Рэфармацыі, калі царкоўныя землі сталі перамяшчацца спачатку ад кароны да арыстакратыі, а пазней – ад збяднелай арыстакратыі да джэнтры. У той час як арыстакратыя перажывала эканамічны заняпад і страту палітычнага ўплыву,

джэнтры ўмацоўвалі свае пазіцыі. Спробы манархіі спыніць гэты працэс прывялі, у канчатковым выніку, да канфлікту ў 1640 г., які перарос у рэвалюцыю. У сваю чаргу Х. Трэвар-Роўпер звярнуў увагу на тое, што рост уплыву зямельнага сярэдняга класа быў звязаны галоўным чынам з яго актыўнасцю ў сферах гандлю, прамысловасці. Па меркаванні гэтага гісторыка, "сапраўдныя" джэнтры, дробныя землеўладальнікі пакутавалі ад інфляцыі, якая прагрэсавала і знаходзіліся ў цяжкім эканамічным становішчы. Менавіта адчай, а не ўпэўненасць у сабе, падштурхнуў іх да ўдзелу ў "Вялікім мецяжы".

**Лоўрэнс Стоўн** інтэрпрэтаваў рэвалюцыю як барацьбу саслоўяў і ўнутрысаслоўных груп (правячых эліт) па палітыка-канстытуцыйных, рэлігійных і іншых пытаннях. Перадумовы рэвалюцыі тлумачыліся гісторыкам, зыходзячы з азначэння ім палітычнага рэжыму Сцюартаў як крызіснага. Гэты крызіс (крызіс арыстакратыі), па меркаванні Стоўна, выяўляўся ў няздольнасці сістэмы прыстасавацца да эканамічных і сацыяльных змен і ў паступовым адыходзе ад яе часткі правячага класа. Прадметам даследавання **Крыстофера Хіла** сталі ідэйна-рэлігійныя і ідэалагічныя перадумовы рэвалюцыі. У сваіх працах ён праводзіў думку аб патэнцыяльных магчымасцях дэмакратычнай плебейскай рэвалюцыі ў 40–50-я гады 17 ст., якім не было наканавана рэалізавацца. Па меркаванні гісторыка, Англійская рэвалюцыя 17 ст. завяршылася перамогай уласнікаў і зацвярджэннем іх ідэалогіі. Яе вынікам стала стварэнне значна больш спрыяльных умоў для развіцця капіталізму, чым тыя, якія меліся да 1640 г.

У апошняй чвэрці 20 ст. праблематыка гісторыі рэвалюцыі вывучалася кансерватыўнымі гісторыкамі ў рамках канцэпцыі ўсеагульнага крызісу 17 ст. Яна інтэрпрэтавалася як палітычны канфлікт, запознены варыянт рэфармацыйнага руху. Аснову яго склалі супярэчнасці паміж "дваром" – дзяржаўнай уладай, якой былі ўласцівыя ўзмацненне цэнтралізацыі, павелічэнне выдаткаў на ўтрыманне бюракратыі, і "краінай" – грамадствам, ад імя якога імкнуўся выступаць кансерватыўны парламент, які супраціўляўся зменам. Гісторыкі-кансерватары даказвалі выпадковасць узнікнення грамадзянскай вайны, імкнуліся давесці, што гэты канфлікт не меў пад сабой сацыяльна-эканамічных падстаў. Яны адмаўлялі наяўнасць у Англіі арганізаванай парламенцкай апазіцыі, указвалі на абмежаванасць яе ўплыву на грамадства, паколькі парламент, які збіраўся нерэгулярна, не быў для правінцыйнага грамадства прызнанай нацыянальнай установай.

Амерыканскія гісторыкі, якія адносіліся да "школы кансенсусу" (**Луіс Харц, Даніэль Бурсцін**), разглядалі Першую Амерыканскую рэвалюцыю як пераважна палітычны рух вельмі ўмеранага характару. Станаўленне ў каланіяльны перыяд ліберальных грамадска-палітычных інстытутаў вызваляла Амерыку ад рэвалюцый падобных еўрапейскім. Паўстаўшыя амерыканцы імкнуліся толькі абараніць ужо склаўшуюся дэмакратычную сістэму ад замаху з боку Англіі. Прыхільнікі тэорыі кансенсусу схільныя падкрэсліваць антыкаланіяльную сутнасць Першай Амерыканскай рэвалюцыі, у рамках якой адбываўся рух не за перамены, а за захаванне

існаваўшых у калоніях сацыяльна-эканамічных парадкаў і палітычных свабод.

3. Найбольш значны ўклад у савецкай гістарыяграфіі ў распрацоўку канцэпцыі Французскай рэвалюцыі канца 18 ст. унёс **Альберт Захаравіч Манфрад** (1906–1976). Рэвалюцыя характарызавалася як буржуазная (прывяла да станаўлення буржуазных капіталістычных адносін) і дэмакратычная (адбылося разбурэнне абсалютызму і пераход да больш дэмакратычных форм дзяржаўнага кіравання і ў ёй актыўны ўдзел прымаў народ). Значэнне рэвалюцыі заключалася ў тым, што яна ліквідавала феадалізм і забяспечыла пераход да капіталізму. Вышэйшай кропкай рэвалюцыі, яе важнейшым этапам лічыўся перыяд якабінскай дыктатуры. Якабінцы падаваліся як тая палітычная плынь, якая ўнесла рашаючы ўклад у ліквідацыю феадальных парадкаў. Падкрэслівалася абмежаванасць буржуазнай рэвалюцыі. Заканчэннем рэвалюцыі А. З. Манфрад лічыў пераварот 9 тэрмідора, г. з. 27 ліпеня 1794 г., калі пала якабінская дыктатура.

У канцы 60-х – 70-х гадах XX ст. разгарнулася дыскусія аб характары якабінізму. Згодна пункту гладжання А. З. Манфрада, якабінская ўлада абапіралася на шырокі блок ад рэвалюцыйнай буржуазіі да плебейства, ўключаючы сялянства, санкюлотаў. З тым, што якабінскі блок уключаў сацыяльныя нізы, звязана наяўнасць у палітыцы якабінцаў эгалітарных, часам антыбуржуазных тэндэнцый. Другую канцэпцыю адстойваў **Уладзімір Георгіевіч Рэвуненкаў**. Згода ёй якабінцы – гэта палітычная плынь рэвалюцыйнай буржуазіі. У асноўным той яе часткі, якая сваім ўздымам (набыццём маёмасці, доступам да ўлады) абавязана рэвалюцыі. Для барацьбы з сіламі “старога парадку” яна пайшла на саюз з сялянствам і санкюлотамі. У выніку ў Францыі ў 1793–1794 гадах склалася своеасаблівае дваеўладдзе. З аднаго боку, дыктатура буржуазіі, якую ўвасабляў Канвент. З другога боку, рэвалюцыйна-дэмакратычная дыктатура сацыяльных нізоў у выглядзе Камуны Парыжа. У. Р. Рэвуненкаў прапанаваў лічыць падзеяй, якая завяршае рэвалюцыю, дзяржаўны паравварот 9–10 лістапада 1799 г. і ўсталяванне дыктатуры Н. Банапарта.

Агульную канцэпцыю Англійскай рэвалюцыі ў савецкай гістарыяграфіі распрацаваў у першую чаргу **Міхаіл Абрамавіч Барг**. Важнейшую асаблівасць сацыяльна-эканамічнага развіцця Англіі канца 16 – пачатку 17 ст. ён бачыў ў тым, што найбольш актыўна працэс фарміравання капіталістычных адносін ішоў у земляробстве, а цэнтр цяжару сацыяльных супярэчнасцяў ляжаў у пазямельных адносінах. Рэвалюцыя забяспечыла пераход Англіі да капіталізму. Акцэнт рабіўся на барацьбу плебейскіх мас за паглыбленне рэвалюцыі. М. А. Барг падкрэсліў, што асновай сацыльнага канфлікту ў ходзе рэвалюцыі было аграрнае пытанне, для вырашэння якога мелася два шляхі. Першы з іх, буржуазна-дваранскі, прадугледжваў умацаванне землеўладанняў лендлордаў. Яго адстойвалі спачатку прэсвітарыяне, затым – індэпендэнты. Другі шлях, сялянска-плебейскі – «сапраўдныя левелеры», дзігеры. Згодна М. А. Баргу, барацьба вакол двух

шляхоў вырашэння аграрнага пытання была стрыжнем усёй сацыяльнай і палітычнай барацьбы ў час рэвалюцыі.

Адным з вядучых спецыялістаў па гісторыі Першай Амерыканскай рэвалюцыі з'яўляўся **Андрэй Аркадзевіч Фурсенка.** Савецкія гісторыкі ў падзеях 1775–1783 гадоў бачылі не толькі вайну за незалежнасць, але і сацыяльную рэвалюцыю. Яны падкрэслівалі, што да рэвалюцыі прывялі не толькі антыкаланіяльныя памкненні жыхароў калоній, але і вострыя супярэчнасці, якія існавалі ўнутры грамадства калоній. Было вылучана палажэнне аб кансерватыўным характары Першай Амерыканскай рэвалюцыі і Канстытуцыі 1787 г., якая юрыдычна замацавала вынікі рэвалюцыі. Савецкая гістарыяграфія прызнавала адсутнасць развітых феадальных адносін у англійскіх калоніях, таму Першая Амерыканская рэвалюцыя трактавалася як унутрыфармацыйная, якая для меўшыхся ўжо буржуазных адносін стварыла больш спрыяльныя ўмовы развіцця, перш за ўсё, праз ліквідацыю каланіяльнай залежнасці.

**Аляксандр Мікалаевіч Чыстазвонаў** вызначае ў Нідэрландскай рэвалюцыі шэраг асаблівасцей. Яна адбылася ва ўмовах, калі буржуазія яшчэ не сфарміравалася. Таму рэвалюцыя мела абмежаваныя наступствы. Тым не менш, яна знішчыла ў Нідэрландах феадалізм і абсалютызм. Пры гэтым, паколькі абсалютызм быў замежным, рэвалюцыя набыла характар вызваленчай вайны супраць Іспаніі. Рэвалюцыя перамагла толькі на поўначы Нідэрландаў, бо тут больш актыўна дзейнічалі сялянска-плебейскія масы, а буржуазія праявіла сябе як больш паслядоўная рэвалюцыйная сіла. Але і на Поўначы буржуазія яшчэ не мела сіл, каб забяспечыць сваё палітычнае панаванне, і ўлада аказалася ў руках вузкага кола гандлёвай алігархіі.

Адным з найбольш аўтарытэтных савецкіх даследчыкаў па праблематыцы Рэфармацыі і Сялянскай вайны ў Германіі з'яўляўся **Юрый Клаўдзіевіч Някрасаў**. Ён разглядаў гэтыя дзве падзеі як буржуазную рэвалюцыю, якая пацярпела паражэнне. Узнікненне рэвалюцыі звязана з развіццём у Германіі ранняга буржуазнага ўкладу. Сялянская вайна разглядалася ў непарыўнай сувязі з Рэфармацыяй, сяляне выступалі за правядзенне рэфармацыйных пераўтварэнняў. Адстойваўся пункт гледжання, што Лютэр – ідэолаг нямецкага бюргерства, прычым кансерватыўнай яго часткі: даследаванні Ю. К. Някрасава, У. Я. Маера.

У постсавецкай гістарыяграфіі адбыліся значныя змены ў трактоўцы ранніх буржуазных рэвалюцый. Што датычыцца Французскай рэвалюцыі, то гісторыкі адмовіліся ад вывучэння рэвалюцыі «знізу», ад «якабінацэнтрысцкага» падыходу. Асуджаўся не толькі якабінскі тэрор, але ставілася пад сумненне каштоўнасць самой рэвалюцыі як спосабу грамадскіх пераўтварэнняў. Храктэрна адмова ад класавага падыходу. Гісторыкі вядуць гаворку не аб класавай барацьбе, а барацьбе розных палітычных груповак, інтарэсы якіх не былі звязаны з пэўнымі класамі. Характарызуючы якабінскую дыктатуру, **Аляксандр Віктаравіч Чудзінаў** выказаў пункт гледжання, што этычная ўтопія рабесп'ерыстаў, якія імкнуліся пабудаваць царства дабрадзецелі, супярэчыла інтарэсам усіх пластоў французскага

грамадства. Пераварот 9 тэрмідора выратаваў Францыю ад катастрофы, якую рыхтавалі ёй якабінцы сваёй палітыкай. **Аляксандр Уладзіміравіч Гардон**, выказвае ў многім супрацьлеглае меркаванне, што за якабінскай ілюзіяй стаялі інтарэсы не столькі буржуазіі, колькі небуржуазнай часткі французскага грамадства, і якабінцы адлюстроўвалі інтарэсы шырокіх мас насельніцтва, сацыяльных нізоў.

Па-новаму вырашаецца пытанне аб кіруючых сілах рэвалюцыі. А. В. Чудзінаў выказвае пункт гледжання, што буржуазія "Старога парадку" ні перад рэвалюцыяй, ні ў ходзе яе не была адзінай, і не з'яўлялася класам-гегемонам у рэвалюцыі. Капіталістычнай буржуазіі сярод кіраўнікоў рэвалюцыі не было. У асноўным гэта былі прадстаўнікі свабодных прафесій.

Постсавецкая гістарыяграфія адмаўляецца ад тэзіса аб існаванні ў Францыі напярэдадні рэвалюцыі феадальнага-абсалютысцкага ладу. А. В. Чудзінаў сцвярджае, што феадалізму адназначна ўжо не было. Абсолютызм таксама не быў абсалютным. Існавалі абмежаванні каралеўскай улады маральнага, рэлігійнага, інстытуцыянальнага парадку. Ён ставіць пад сумненне тэзіс, што рэвалюцыя паскорыла развіццё капіталізму.

Па-іншаму постсавецкая гістарыяграфія ацэньвае і характар тэрмідарыянскага рэжыму. **Дзмітрый Юр'евіч Бавыкін** лічыць, што ў тэрмідарыянскі перыяд не адбывалася абмежавання правоў і свабод французаў. Адмены ўведзенага якабінцамі максімуму дабівалася не толькі буржуазія, але і рабочыя. Палітычная эліта ў той момант бачыла задачу ў тым, каб выйсці з рэвалюцыйнага працэсу і забяспечыць стабільнасць.

Пры вывучэнні Першай Амерыканскай рэвалюцыі **Уладзімір Віктаравіч Согрын** робіць выснову, што яна была перш за ўсё антыкаланіяльнай, а тэзіс савецкай гістарыяграфіі, што канфлікты паміж рознымі слаямі амерыканскага грамадства мелі вялікае значэнне для ўзнікнення рэвалюцыі, трэба лічыць перабольшваннем. Рэвалюцыйная сітуацыя была створана агульнаамерыканскім антыкаланіяльным рухам. Але з моманту абвяшчэння незалежнасці народ заявіў аб сабе як палітычная сіла і з гэтага моманту Вайна за незалежнасць становіцца двайной рэвалюцыяй: антыкаланіяльнай і ўнутрыпалітычнай. На думку У. В. Согрына, Першая Амерыканская рэвалюцыя была найбольш дэмакратычнай з ранніх буржуазных рэвалюцый, бо стварыла найбольш дэмакратычную дзяржаву.

**Галіна Аляксееўна Штохіна-Мардвінцава** прычыны Нідэрландскай рэвалюцыі бачыць перш за ўсё ў спрабах Філіпа II распаўсюдзіць на Нідэрланды сістэму іспанскага абсалютызму. Важная роля ў наспяванні рэвалюцыі адводзіцца рэлігійнаму пытанню. Эканамічныя праблемы знаходзяцца на другім плане. Адзначае, што рэвалюцыя набыла характар вайны за незалежнасць. Яна прывяла да радыкальных змен у грамадскіх адносінах і спосабах кіравання. Узнікла буржуазная дзяржава і былі створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця буржуазных адносін.

Пазіцыя расійскай гістарыяграфіі па пытаннях Рэфармацыі і Сялянскай вайны знайшла адлюстраванне ў фундаментальнай працы "Сусветная гісторыя" ў 6 т. Гэтыя падзеі разглядаюцца як глыбокі сацыяльны крызіс.

Рэфармацыя разшатала стабільнасць саслоўнага грамадства, праяўленнем чаго стала рыцарскае паўстанне і сялянская вайна. Апошняя разглядаецца перш за ўсё як выступленне сельскіх абшчын супраць памеснай юстыцыі. Але, лічаць аўтары выдання, паражэнне паўстання не азначала рэзкага прававога пагаршэння становішча сялян.

Сёння ўсё большая колькасць спецыялістаў па гісторыі германскай Рэфармацыі звяртае ўвагу на тое, што ў ходзе яе развіцця не было выпрацавана праграмных дакументаў, якія змяшчаюць уласна буржуазныя патрабаванні. Нават там, дзе бюргерства праявіла сябе як дастаткова актыўная сіла, вылучаліся праекты грамадскага пераўладкавання, у якіх гаворка ішла не аб задавальненні запатрабаванняў буржуазна-прадпрымальніцкіх пластоў насельніцтва, а толькі аб абароне інтарэсаў гарадской абшчыны як адной з саслоўных карпарацый сярэдневяковага грамадства.

4. Для вывучэння гісторыі Новага часу, у прыватнасці, гісторыі ранніх буржуазных рэвалюцый, першаступеннае значэнне маюць пісьмовыя гістарычныя крыніцы. З канца 15 ст. адбываюцца кардынальныя зрухі ў характары гістарычных крыніц. На працягу 16–17 стст. адыходзяць на другі план летапісы, жыцція. Але з'яўляецца мемуарыстыка, статыстыка, перыядычны друк. Вынаходніцтва кнігадрукавання аказала велізарны ўплыў на фарміраванне гістарычных крыніц у перыяд Новага часу. Іх аб'ём рэзка вырас. Кнігадрукаванне прывяло да шырокага распаўсюджвання гістарычных і публіцыстычных прац, якія для сённяшніх даследчыкаў з'яўляюцца важнымі гістарычнымі крыніцамі.

Можна выдзяліць некалькі тыпаў крыніц, якія маюць асабліва важнае значэнне для вывучэння гісторыі ганніх буржуазных рэвалюцый. Па-першае, гэта заканадаўчыя крыніцы. Яны аб'ядноўваюць нарматыўныя дакументы, якія санкцыянаваны вярхоўнай уладаю. Па-другое, акты. Гэта фактычна ўсе афіцыйныя акументы, у якіх зафіксаваны судовыя рашэнні, маёмасныя і іншыя правы, прывілеі, абавязкі. Актамі фіксуюцца адносіны паміж фізічнымі асобамі, паміж фізічнымі асобамі і дзяржавай, паміж грамадскімі структурамі і дзяржавай, паміж дзяржавамі. Галоўнае адрозніванне актаў ад заканадаўчых крыніц у тым, што ў выпадку з заканадаўствам дзяржава выступае як крыніца прававых норм, а ў актах дзяржаўная ўлада дзейнічае на аснове ўжо існуючага заканадаўства як адзін з бакоў. Сярод наратыўных (апавядальных крыніц) найбольш важнае значэнне для вывучэння рэвалюцый маюць мемуары. Яшчэ адзін від крыніц – публіцыстыка. Яна ўключае памфлеты, адкрытыя лісты, фельетоны, прамовы. Новым тыпам крыніц, якія атрымалі распаўсюджванне ў Новы час, з'яўляецца перыядычны друк.

Для вывучэння гісторыі Рэфармацыі і Сялянскай вайны ў Германіі маюць важнае значэнне публіцыстычныя крыніцы: работы Лютэра, Меланхтона, Мюнцара, лісты Карла V, працы іншых як прыхільнікаў, так і праціўнікаў Рэфармацыі. Таксама такія заканадаўчыя крыніцы яе папскія булы, эдзікты імператара Карла V, эдзікты правіцеляў асобных германскіх

дзяржаў. Адносна Сялянскай вайны 1524-1525 гг. на першы план у якасці гістарычных крыніц выходзяць праграмныя дакументы паўстаўшых. Гэта “12 артыкулаў”, “Гейльбронская праграма”, “Артыкулейны ліст”.

Нідэрландская рэвалюцыя мае ў якасці крыніц вялікі фонд заканадаўчых крыніц. Ён уключае пратаколы правінцыйных і Генеральных штатаў, гарадскіх саветаў і “Крывавага савета”. Вялікі па аб’ёму масіў заканадаўчых крыніц ствараюць распараджэнні, якія належаць дзяржаўным дзеячам часоў Нідэрландскай рэвалюцыі: Філіпа II, кардынала Гранвелы, Маргарыты Пармскай, герцага Альбы, Вільгельма Аранскага і інш. Захавалася таксама перапіска ўдзельнікаў рэвалюцыйных падзей у Нідэрландах. На працягу рэвалюцыі былі заключаны шматлікія дагаворы, уніі, якія ўтвараюць групу актавых крыніц. Гэта Утрэхцкая ўнія, Араксская унія, Генцкія замірэнні, Вечны эдзікт.

Для даследавання Англійскай рэвалюцыі адзначым першаступеннае значэнне заканадаўчых крыніц, якія належаць парламенту часоў рэвалюцыі. Гэта такія дакументы, як Трохгадовы акт, Вялікая рэманстрацыя, навігацыйныя акты, Інструмент кіравання. Англійская рэвалюцыя парадзіла цэлы рад публіцыстычных крыніц, перш за ўсё памфлетаў. Гэта памфлеты Джона Лільберна “Абарона прыроджанага права Англіі”, “Новыя ланцугі для Англіі”. Джэрарда Уінстэнлі “Закон свабоды”. Для даследавання Англійскай рэвалюцыі важнае значэнне маюць мемуарныя крыніцы: гэта мемуары лорда Кларэндона, Карла II, Якава II. Прымяняльна да Англійскай рэвалюцыі можна ўжо гаварыць пра такі тып крыніц як перыядычны друк. З 1641 г. пачаў выходзіць “Дзённік, ці змест усіх пасяддэнняў парламента”.

Пры вывучэнні Першай Амерыканскай рэвалюцыі сярод заканадаўчых крыніц у якасці важнейшых выступаюць Артыкулы Канфедэрацыі1781 г. і Канстытуцыя ЗША 1787 г. Таксама да гэтага тыпу крыніц адносіцца Дэкларацыя незалежнасці ЗША. Яшчэ выжнымі заканадаўчымі крыніцамі выступаюць заканадаўчыя дакументы асобных штатаў. Крыніцамі па гісторыі Першай Амерыканскай рэвалюцыі выступае блок публіцыстычных матэрыялаў. Гэта памфлетныя працы Томаса Джэферсана, Томаса Пейна, Патрыка Генры, Самюэля Адамса. Для Першай Амерыканскай рэвалюцыі характэрна наяўнасць такой гістарычнай крыніцы як перыядычны друк. У якасці актавых крыніц неабходна ўказаць у першую чаргу на міжнародныя дагаворы паміж ЗША і Францыяй, Парыжскі мір 1783 г. з Англіяй.

Пры вывучэнні змен у дзяржаўным ладзе Францыі ў ходзе рэвалюцыі канца 18 ст. важнейшай заканадаўчай крыніца выступаюць прынятыя ў рэвалюцыйныя часы канстытуцыі. Таксама важнейшая заканадаўчая крыніца – гэта Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна. Заканадаўчымі органамі рэвалюцыйнай Францыі быў прыняты комплекс законаў у аграрнай сферы, накіраваных на стварэнне новай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай сістэмы Францыі, рэгулюючых сацыяльна-эканамічныя адносін (закон Шапелье, закон аб максімуме).

Шмат дзеячаў Французскай рэвалюцыі пакінулі свае мемуары. Гэты Брысо, Лафает, Некер, Барас. Што датычыцца публіцыстычных крыніц, то

хораналагічна першымі, якія маюць дачыненне да рэвалюцыі, трэба адзначыць наказы ў час выбараў у Генеральныя штаты ў 1789 г. Тады ж з'яўляецца і серыя памфлетаў. Самы вядомы з іх абата Сійеса "Што такое трэцяе саслоўе?".У час рэвалюцыі ў Францыі зявіцца велізарная маса памфлетнай літаратуры, якая была створана як прыхільнікамі, так і праціўнікамі рэвалюцыі. Важнай групай публіцыстычных крыніц з'яўляюцца прамовы дзеячаў рэвалюцыі. Для Французскай рэвалюцыі перыядычны друк як крыніца набывае яшчэ большае значэнне ў параўнанні з Англійскай.